**8 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праходзіла ўрачыстая цырымонія перадачы каля 300 асобнікаў гістарычнай, навукова-папулярнай і метадычна-педагагічнай літаратуры. Гэтыя кнігі былі атрыманы пры актыўнай дапамозе Пасольства Беларусі ў Польшчы з асабістага архіва нашага земляка, беларуса па паходжанні, вядомага навукоўца і даследчыка, прафесара Базыля Белаказовіча.**

# Нацыянальная бібліятэка прымае дар

На цырымоніі перадачы кніг прысутнічалі прадстаўнікі Пасольства Беларусі ў Польшчы, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.Матульскі, старшыня Нацыянальнай камісіі РБ па справах ЮНЕСКО У.Шчасны і дырэктар Беларускага Фонду культуры У.Гілеп.

Як зазначыў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Р.Матульскі, шэраг установаў Беларусі актыўна працуе над захаваннем нацыянальнай спадчыны, а таксама над захаваннем кніжнай культуры. І адным з галоўных накірункаў гэтай дзейнасці з'яўляецца вяртанне кніжных помнікаў, якія па волі лёсу апынуліся не на тэрыторыі Беларусі.

Саветнік па культуры і адукацыі Пасольства Беларусі ў Польшчы Т.Стружэцкі падкрэсліў, што "беларуская дыяспара ў Польшчы вельмі ад-

метная. Шмат знакамітых беларусаў унеслі значны ўклад у развіццё беларускай, польскай і сусветнай культуры. Можна было б назваць не адзін дзесятак пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, кіраўнікоў польскіх вядучых навучальных устаноў, беларусаў па сваім паходжанні, якія захавалі вялікую любоў да Беларусі і перадаюць гэтую любоў іншым. Такім чалавекам з'яўляецца прафесар Базыль Белаказовіч, ураджэнец колішняй Беластоцкай вобласці, якая калісьці была тэрыторыяй Беларусі. Беларус па сваім духу, які прысвяціў сваю навуковую дзейнасць перш за ўсё беларуска-польскім гістарычным стасункам".

Б.Белаказовіч у сваёй прамове перш за ўсё сказаў, што вельмі ўзрадаваўся адкрыццю новага прыгожага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Ён высока ацаніў беларускіх вучоных-славістаў і адзначыў, што без іх работ у галіне гуманітарных навук зараз немагчыма вывучаць гісторыю і літаратуру Польшчы, Беларусі і ўвогуле ўсходне-славянскіх земляў.

Дырэктар Беларускага Фонду культуры У.Гілеп выказаў цікавае параўнанне: "Я ўспомніў той слоган, які мы ўсе ведаем: "Купляйце беларускае". І трохі перайначыў яго: "Шукайце беларускае". Шукайце ў сябе дома, шукайце за межамі. І тое, што зараз побач з намі знаходзіцца спадар Белаказовіч, якраз і ёсць вынік таго, што мы шукаем адзін аднаго, як ён нас, так і мы яго".

У.Гілеп падкрэсліў, што ў шматлікіх установах Шчэціна, якія маюць дачыненне да беларуска-польскіх адносін і якія ён наведаў, усюды сустракаў беларусаў альбо беларусаў па паходжанні. І гэта аблягчала пошукі беларускага. Таму нам трэба ўмацоўваць гэтыя сувязі — дзеля таго, каб да нас вярталіся беларускія скарбы. Учынак Базыля Белаказовіча, — сказаў на заканчэнне У.Гілеп, — гэта адна з першых ластавак, якія робяць нам добрае надвор'е і ўмовы для вяртання беларускага на Беларусь.

**Наш кар.**